

Раман Скірмунт у Італії, пачатак XX стагоддзя.

# Раман Скірмунт: загадкавы сфінкс беларускай палітыкі

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**У 2018 годзе доктар гістарычных навук Алесь Смалянчук выпусціў 700-старонкавую кнігу «Раман Скірмунт (1868–1939). Жыццяпіс грамадзяніна Краю». Мы выбралі з яе шэраг нечаканых фактаў пра аднаго з прэм'ераў БНР.**

### Бацькі мелі 10 дзяцей, але разам не жылі

Аляксандр ажаніўся з Тэафілай Любанскай. Першых назвалі ў гонар бацькоў — Тэафіла і Аляксандр. Пара разам не жыла: Тэафіла толькі зімавала ў Парэччы, а з вясны да восені жыла ў Тэклінаполі на Вілейшчыне.

сялянка Кацярына Цярэшка, ці то на 7, ці то на 12 гадоў маладзейшая.

Кацярына стала ўдавой у 1915-м, прычым помнік яе мужу ставіў сам Скірмунт, на камені захаваўся надпіс: «*Pamięci Romana Tereszki. Druha wiernego Romana Skirmunta poswięcam*». Фурман трагічна загінуў у 40 гадоў — скінулі коні.

Сыноў Кацярына нарадзіла яшчэ пры мужу, але не ад яго, лічаць вяскоўцы, з якімі размаўляў Алесь Смалянчук. Бо ўсе чацвёра сыноў: Олесь, Раман, Уладзімір і Петрусь — «былі падобныя да Скірмунта як партрэты».

Кацярына дажыла да 1957 года, а лёс сыноў склаўся па-рознаму. Олесь пражыў 37 гадоў, памёр у вайну. Вядома, што ажаніўся

гэты шлюб не ўхваліў, не даў дрэва на хату, і маладым прыйшлося пераехаць у суседнюю вёску. Олесь стаў кавалём, яго жонка Гэля — краўчыхай.

Іншы сын, Раман, быў леснікам у маёнтку Скірмунта, у 1939 годзе высланы. Петрусь у час вайны служыў у паліцыі, адступіў разам з немцамі. У Польшчы яго нібыта арыштавалі, вывезлі на Усход.

Уладзімір Цярэшка дажываў пры маці, а ягоныя дзеці перабраліся ў Пінск.

### Меў дзяцей ад некалькіх жанчын?

Магчыма, Кацярына Цярэшка была не адзінай жанчынай Скірмунта. Алесь Смалянчук запісаў успаміны кабеты, якая

З поўным тэкстам дакумента можна азнаеміцца ў бібліятэцы